■ Разбурэнне шаблонаў

Калі б вы ведалі, з якога смецця...

НЕЗВЫЧАЙНАЯ ВЫСТАЎКА ПРАЦУЕ Ў ГОМЕЛІ

Знаёмая сітуацыя, калі захоўваць няма дзе, а выкінуць шкада? Ёсць выйсце: з галавой акунайцеся ў трэш-арт, як гродзенец Алег Ёрш. У Гомелі зараз экспануецца яго выстава, на якой прадметы, што павінны былі паўстагоддзя таму апынуцца на звалцы, набылі новае жыццё і прызначэнне.

Калі ў вас спецыфічнае пачуццё гумару, схільнае да чорнага колеру, вам сюды, у галерэю імя Гаўрыіла Вашчанкі. Яно будзе здаволена. Дарэчы, інсталяцыі, прадстаўленыя ў экспазіцыі, вось так — у поўнай калекцыі — нідзе не выстаўляліся. Іх трэба разглядаць уважліва і чытаць подпісы, якія дапамогуць растлумачыць або развіць шэраг асацыяцый, абудзяць ужо вашу фантазію. Аўтапартрэт Алега Ёрша, напрыклад, уяўляе металічны набор вілаў для печы, багор і рыдлёўку. Сабранае ў мудрагелістую канструкцыю, здалёк усё гэта нагадвае шкілет вялікай рыбіны. Калі даведваешся, што працуе майстар усталёўшчыкам помнікаў, можна зразумець, адкуль такое своеасаблівае адчуванне сусвету.

Між тым на выставе ёсць шматлікія прадметы традыцыйнага беларускага побыту. Але ж іх аўтэнтычны сэнс наўмысна скажоны. Ночвы, у якіх мылі бялізну і секлі капусту, сталі адметнай паліцай, а пранікі, якімі пралі бялізну, набылі вока-люстэрка і металічнае шчаціння. Драўляныя бочкі розных памераў ператвараюцца ці то ў імбрычкі, ці то ў крэсла на металічнай рэсоры, якое раяць выкарыстоўваць тым, хто хоча праверыць свой вестыбулярны апарат. Дэталі калаўрота можна ўгадаць у самаробным ровары, а старажытная швейная машынка-малаток прыстасаваная для металічнай клёпкі драўляных бочак.

Жанчыны не могуць нагледзецца на лыжы з лапцямі на абцасах. Відаць, шкадуюць, што арт-аб'ект не для продажу. На выставе знайшлося месца і лірычным пачуццям. Па жыцці разам ідуць керамічныя электраізалятары, а іржавыя пагнутыя цвікі ў рытме танга даказваюць, што каханню пакорныя не толькі ўсе ўзросты, але і ўсё, што нават не рухаецца.

Выстава мае назву «Жэсць». Бляшанкі тут таксама выкарыстоўваюцца, але іншым сэнсам назвы нас хочуць падвесці да сучаснасці і падкрэсліваюць імкненні аўтара здзівіць гледача. Атрымліваецца.

Як атрымліваецца і паіранізаваць над часам маладосці старэйшага пакалення беларусаў. Артэфакты з 50—70-х сёння выклікаюць цікавасць і настальгію. У такім своеасаблівым аўтарскім спалучэнні — яшчэ і ўсмешку. Ручная мясарубка вышчарылася букетам цвікоў, а паштовая скрыня перапрацоўвае газеты на туалетную паперу. Алюмініевы імбрык у акулярах вітаецца з гітарай, якая ператварылася... у начны гаршчок.

Мастацтва не для слабанервовых. Дарэчы, трэш-арт не сёння нарадзіўся на свет. Уражваць і шакіраваць у далёкім 1918 годзе пачаў усіх немец Курт Швіцерс з Ганновера. Яго эксперыменты ў галіне абстрактнага мастацтва паклалі пачатак стылю, які дэманструе пратэст супраць шаблонаў мыслення. Галоўны захавальнік карціннай галерэі Алег Курашоў гаворыць, што гэта выстава-эксперымент:

— Англійскае слова trash азначае «смецце». Насамрэч, не ўсё смецце падлягае ўтылізацыі. З тых рэчаў, якія сваё адпрацавалі, можна зрабіць шмат чаго цікавага. І майстар з Гродна Алег Ёрш даказвае, што гэта сапраўды так. Прадстаўленыя арт-аб'екты зроблены з іроніяй, але вобразы зразумелыя для прачытання.

У сваім родным горадзе аўтар выставы стаў знакаміты тым, што заснаваў музей прасаў, якія збіраў на працягу многіх гадоў. У Гомель даехала каля сарака аб'ектаў трэш-арту, якія ствараліся апошнія 15 гадоў і паслядоўна ўвасабляюць прынцып сумяшчэння несумяшчальнага.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*
Фота аўтара

■ Філатэліст

КАЛДУНЫ — НА МАРЦЫ

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь 18 студзеня выпусціла ў абарачэнне новую паштовую марку «Нацыянальная кухня. Калдуны».

Гэта працяг серыі марак з эмблемай рэгіянальнай садружнасці ў галіне сувязі (РСС). Першыя былі прысвечаны 20-годдзю РСС, беларускаму народнаму адзенню, біятлону як зімняму відусорту, касцёлу ў гонар святых Сымона і Алены.

У дзень выпуску ў сталічным паштамце адбылося спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

Даты Падзеі Людзі

20 СТУДЗЕНЯ

1920 год — нарадзіўся Федэрыка Фелліні, італьянскі кінарэжысёр, уладальнік пяці прэмій «Оскар». Ён прыйшоў у кінаіндустрыю ў 1940 годзе. Спачатку складаў камічныя трукі, затым удзельнічаў у стварэнні сцэнарыяў і, нарэшце, стаў асістэнтам рэжысёра. Першы яго фільм у гэтай якасці — «Рым — адкрыты горад», зняты ў 1945 годзе, за ім было створана яшчэ некалькі стужак, і з 1950-х гадоў Фелліні стаў самастойным рэжысёрам. У яго першых фільмах — «Белы шэйх» (1952) і «Сынкі-сынкі» (1953) — выяўляюцца асноўныя рысы, якія адрозніваюць Фелліні ад яго шматлікіх калег: увага да асобы і павышаная цікавасць да дэталяў. Фільм «Дарога» (1954) зрабіў Фелліні і яго жонку Джульету Мазіну, выканаўцу галоўнай ролі, сусветна вядомымі. Ён атрымаў «Оскар» як найлепшы фільм на замежнай мове. Усяго Фелліні атрымаў 4 такія «Оскары» і яшчэ аднаго — за творчасць у цэлым.

1953 год — нарадзіўся (г. Мінск) Сяргей Аляксандравіч Жданок, беларускі фізік. Акадэмік НАН Беларусі (2003). Доктар фізіка-матэматычных навук (1994). З 1979 года працаваў у Інстытуце цепла- і масаабмену НАН Беларусі. У 2002—2004 гг. — вучоны сакратар НАН Беларусі. Аўтар больш як 230 навуковых прац. Навуковыя працы ў галіне фізікі і хіміі нераўнаважных працэсаў і іх тэхнічных прымяненняў. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1986), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2002).

1958 год — на вуліцах Лондана з'явіліся першыя ў свеце радары за кантролем хуткасці аўтамабіляў. Шмат што змянілася ў іх рабоце за больш чым паўвекавую гісторыю — ад першых велізарных стацыянарных датчыкаў хуткаснага сачэння да амаль непрыкметных камер, але пільныя тэхнічныя памочнікі і да гэтага часу на ўзбраенні ў супрацоўнікаў ДАІ. Быў час — інспектары дарожнага руху замяралі хуткасць практычна «на вока», з секундамерам ці гадзіннікам у руках вылічалі рух машыны ад аднаго слупа да другога. Цяпер гэта ўжо вядома хіба што па ўспамінах ветэранаў. Сёння на ўзбраенні інспектараў — разнастайныя дарожныя радары, тэле- і фотакамеры, перасоўныя пасты.

Было сказана

Максім ТАНК, народны паэт Беларусі:
Я знаў толькі адну зорку —
Пяціканцовую далонь маці.

Яўгена ПЯСЕЦКАГА

ФОТА СЛОВА

Па Ігуменскаму тракту
Йшлі ваўкі «калядаваць»,
А насустрач ехаў трактар
Снег ля фермы разграбаць.
Трактарыст — абы-які:
Зранку выпіў моцна...
Сталі раіцца ваўкі,
Што рабіць з прахвостам?

— З'есці? Нельга аніяк,
Бо смярдзіць сівухай, —
Аж скрывіўся іх важак,
Пачухаўшы вуха.
(Шэры маху не дае,
Гэта кожны ведае:
Ён з чысцюткай рэчкі п'е
І гусямі снедае...)
Але ёсць усё ж тады
Добры паратунак:
Трэба выклікаць ДАІ —
Здаць у пастарунак!
Там і страціў трактарыст
Да гарэлкі схільнасць,
А ваўкам даслаў свой ліст:
«Дзякую за пільнасць».

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

10 ПАМЫЛАК ПРЫ ВЫБАРЫ НАСЕННЯ

На жаль (а можа, і на шчасце), абысціся толькі сваім насеннем мы не можам — заўсёды хочацца пасадзіць на ўчастку новыя расліны і сарты, у пошуках якіх мы адпраўляемся ў крамы насення. Цалкам паглыбіўшыся ў свет яркіх каляровых пакуначкаў, мы зусім забываемся на правілы выбару і куплі насення. Не дзіўна, што ў канчатковым выніку вырастае ў нас часам зусім не тое, што чакалася. Якія ж памылкі мы дапускаем, выбіраючы насенне, і як іх пазбегнуць?

Памылка 1: няўвага да якасці

На рынку нямала няякаснай прадукцыі: пратэрмінаванага насення, разнастайнай перасорцицы. Купіўшы такі пасяўны матэрыял, вы рызыкуеце не толькі будучым ураджаем і прыгажосцю клумбы, але і здароўем свайго саду і агарода: з няякасным насеннем можна занесці розныя хваробы раслін і нават пустазелле, пазбавіцца ад якіх будзе ох як не проста.

Каб ваш час, сілы і грошы не былі змарнаваныя, будзьце заўсёды пільныя:

- не набывайце насенне невядомых вытворцаў — выбірайце фірму, якая шануе сваю рэпутацыю;
- не купляйце насенне на латках, у выпадковых прадаўцоў — рабіце гэта толькі ў спецыялізаваных крамах, якія выконваюць умовы захоўвання і тэрміны рэалізацыі;
- выбіраючы насенне ў інтэрнэт-крамах, памятайце пра «тэхніку бяспекі» такіх пакупак.

Памылка 2: маляўнічы пакет — добрае насенне

У так званых «белых» пакетах — гэта значыць упакоўках без малюнкаў — насенне па якасці, як правіла, зусім не горшае, чым у каляровых пакетах з фотаздымкамі. Насцярожыць павінна адсутнасць на пакеце інфармацыі пра вытворцу, нумар партыі насення, тэрмін яго прыдатнасці; не варта спяшацца з купляй і ў тым выпадку, калі тэрмін прыдатнасці нанесены друкарскім спосабам — на кожнай партыі насення яго павінны праштампаваць асобна.

Памылка 3: выбар «па малюнку»

Выбіраючы насенне толькі «па прыгожым малюнку» і прывабнай назве, мы робім велізарную памылку: карцінка зусім не заўсёды адпавядае выніку! Купляючы насенне, звярнуцца ўвагу на характарыстыкі пасяўнога матэрыялу, названыя на ўпакоўцы: колькасць насення, працягласць вегетацыйнага перыяду, вышыня раслін, тэрміны цвіцення і плоданашэння, умовы вырошчвання і гэтак далей.

Памылка 4: купля гібрыднага насення для атрымання ўласнага

Тыповая памылковая думка многіх садаводаў: купіўшы дарагое насенне гібрыдных раслін (з маркіроўкай F1) аднойчы, у далейшым на іх куплю можна не траціцца, сабраўшы ўласнае.

Вядома, расліны з такога насення вылучаюцца больш высокай ураджайнасцю і ўстойлівасцю да захворванняў. Яны не так патрабавальныя да ўмоў вырошчвання, у іх наогул маса добрых якасцяў. Але іх кожны раз неабходна купляць у краме!

Калі вы купляеце насенне, каб у далейшым атрымліваць уласнае, лепш адразу адмоўцеся ад набыцця гібрыдаў. Паверце, нічога добрага з такога эксперыменту не выйдзе: сабраўшы і пасеяўшы насенне гібрыдных раслін, вы атрымаеце зусім іншыя сарты, якія мала чым будуць нагадваць сваіх «прабацькоў», прычым адрозненні будуць, хутчэй за ўсё, не ў лепшы бок.

Памылка 5: адмаўленне ад прымянення дражаванага насення

Чалавеку ўласціва баяцца ўсяго новага і незразумелага, і менавіта так сёння некаторыя дачнікі ставяцца да дражаванага насення, памылкова думаючы, што расліны з яго могуць нанесці шкоду здароўю. Гэта не так. «Дражаваным» называюць звычайнае насенне, апрацаванае комплексам стымулятараў і ўгнаенняў, якія прыносяць толькі карысць раслінам, таму баяцца іх не варта. Адзінае, што трэба памятаць, набываючы такое насенне, — саджаць яго трэба ў вільготную глебу, але абавязкова сухім.

Памылка 6: недаацэнка раянавання і залішняя цяга да экзотыкі

Не варта купляць насенне дзіўных раслін, якія наўрад ці вырастуць у клімаце вашай мясцовасці. Толькі раянаваныя гатункі максімальна прыстасаваныя да кліматычных умоў канкрэтнага рэгіёна, яны каштуюць танней за «заезджыя», добра развіваюцца, атрыманыя з іх расліны не патрабуюць вялікага догляду ў далейшым і практычна заўсёды з'яўляюцца больш ураджайнымі.

Памылка 7: новае — значыць лепшае

Насенне-навінка павінна займаць не больш за 30% ад агульнай колькасці пасяўнога матэрыялу, інакш вы рызыкуеце застацца і без прыгожай клумбы, і без добрага ўраджаю.

Памылка 8: купля «ў запас»

Вядома, пасяўны матэрыял, расфасаваны ў сучасную фальгаваную ўпакоўку, захоўваецца даўжэй, чым насенне, традыцыйна спакаванае ў паперу. Але не варта забываць: пазначаны на фальгаванай упакоўцы тэрмін прыдатнасці «працуе» толькі ў дачыненні да запячатанага тавару. Ды і наогул забяспечыць насенню дома ідэальныя ўмовы захоўвання цяжкавата, і наша «запаслівасць» можа абярнуцца суцэльнымі расчараваннямі.

Памылка 9: спантанная купля

Даволі часта, паддаўшыся нейкай мімалётнай спакусе, захапіўшыся малюначкамі або натхняльным апісаннем, мы спантанна купляем насенне, а рабіць гэтага не варта. Хутчэй за ўсё, частка набытага апынецца відавочна лішняй. Перад тым, як адпраўляцца ў краму, праверце свой запас: пратэрмінаванае насенне выкіньце, прыдатнае для пасеву пакіньце, а пасля гэтага пралічыце, колькі трэба купіць новага насення і якога менавіта.

Памылка 10: неапраўданая эканомія

Дарагое насенне і насенне сярэдняга кошту, часцей за ўсё, з'яўляецца якасным, а вось казаць пра якасць таннага насення, на жаль, не даводзіцца. Гаворка ідзе не пра насенне ў белых пакетах, а пра таннае насенне ў каляровых упакоўках сумніўнай якасці: неакуратна склееных, з дрэнным шрыфтам, размытымі малюнкамі і гэтак далей. Не эканомце на насенні, старайцеся набываць якасны насенны матэрыял.

Ліст у тэму

«У мінулым годзе я набыў насенне гарбуза «Пінк Джамба Банана». Фасоўшчык — ААТ «Аграрна-прамысловы дом». Тэрмін прыдатнасці — да 12.2017 года. Усе гэтыя звесткі былі на пакеціку з насеннем. Я заўсёды захоўваю пакеты да самага збору ўраджаю, і гэты таксама. 24 мая я гэтае насенне (5 штук), а таксама насенне кабачкоў і звычайных гарбузоў паклаў ў анучку на прарошчванне ў цёплым пакоі. Дзён праз пяць прараслі кабачкі, праз тыдзень — свае гарбузы, а «Пінк Джамба Банана» — праз 10 дзён. І прарасла ўсяго адна семка з пяці. Усходжасць атрымліваецца — 20%. Тэлефанаванне ў фірму, якая фасавала насенне, ніякага выніку не прынесла. Маўляў, зараз гэтага чалавека няма на месцы, вам ператэлефануюць. Але гэтага не адбылося. Таму вырашыў напісаць у газету, тым больш што і раней у мяне былі праблемы з насеннем ад «Аграрна-прамысловага дома». Я набываю яго толькі ў спецыялізаваным магазіне. Вопыт вырошчвання розных відаў раслін маю добры. Больш за 20 гадоў у мяне на градках можна сустрэць не толькі гарбузы і кабачкі, але і кавуны, дыні і яшчэ шмат іншых раслін. Нават жэньшэнь ёсць. Тым больш што насенне, якое я нарыхтаваў сам, прарасло, а гэта — не. А я ж пакінуў у агародзе месца — гарбуз моцна разрастаецца. І ў сярэдзіне чэрвеня пазнавата было саджаць штосьці іншае.

Летась як ніколі дрэнная ўсходжасць была і ў іншага набытага насення, у прыватнасці насення дыні ад «Мінсксортсемгародніна». З 12 штук узышло толькі 5. Усходжасць — 41,7%. Навошта ж прадаваць такое?

Напішыце пра гэта абавязкова. Няхай людзі ведаюць!»

ІВАНОЎ Мікалай Мікалаевіч.
в. Зелянец, Карэліцкі раён.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	9.15	17.26	8.11
Віцебск	9.11	17.10	7.59
Магілёў	9.05	17.16	8.11
Гомель	8.55	17.20	8.25
Гродна	9.29	17.43	8.14
Брэст	9.23	17.50	8.27

Месяц

Першая квадра 17.01—23.01.
Месяц у сузор'і Блізнят.

Імяніны

Пр. *Ілоны, Васіля, Івана.*
К. *Людмілы, Себасцьяна.*

Фота Надзеі БУЖАН.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	-6..-4°С	КІЕЎ	-9..-7°С	РЫГА	-8..-6°С
ВІЛЬНЮС	-8..-6°С	МАСКВА	-11..-9°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	-9..-7°С

УСМІХНЕМСЯ

Паглядзеў фільм «Які выжыў». Як высветлілася, Дзі Капрыа ўсё ж умее плаваць у ледзяной вадзе!

— Вой, які пузік! Хлопчык ці дзяўчынка?

— Аліўе.

«Склад-будоўля рэалізуе пясок, цэмент, арматуру па цэнах, ніжэйшых за рыначныя. Самавываз, працуем без выхадных з 23.00 да 05.00, спытаць вартаўніка Сцяпана».

— Не, спрачацца я не люблю.

— Гэта добра.

— Але магу ўкусіць.

У паліглотаў роднай лічыцца тая мова, на якой мацюкаешся.

Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.941. Індэкс 63850. Зак. № 249.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 12 студзеня 2016 года.